ЗАЦВЕРДЖАНА

Загад Міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь
28.10. 2026 № 453

Білеты
для правядзення экзамену ў парадку экстэрнату
пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы
базавай адукацыі
па вучэбным прадмеце «Інфарматыка»

2026/2027 навучальны год

Білет № 1

1. Інфармацыя, віды інфармацыі, носьбіты інфармацыі.

2. Заданне на падрыхтоўку прапанаванага тэксту да друку (устаноўка палёў старонкі, арыентацыі старонкі, колькасці старонак на лісце).

Білет № 2

1. Паняцце аб інфармацыйных працэсах.

2. Заданне на стварэнне электроннай табліцы, арганізацыю вылічэнняў з выкарыстаннем адносных і абсалютных спасылак.

Білет № 3

1. Апаратнае забеспячэнне сучаснага камп'ютара: працэсар, устройствы памяці, устройствы ўводу-вываду.

2. Заданне на фармаціраванне сімвалаў прапанаванага тэксту па паказаным узоры (шрыфт, памер, напісанне, колер сімвалаў, колер фону сімвалаў).

Білет № 4

1. Віды аперацыйных сістэм. Элементы графічнага карыстальніцкага інтэрфейсу аперацыйнай сістэмы Windows.

2. Заданне на выкананне асноўных аперацый з файламі (перайменаванне, капіраванне, перанос, выдаленне).

Білет № 5

1. Паняцце аб файлавай сістэме. Імя файла. Тып файла.

2. Заданне на стварэнне растравага відарыса з выкарыстаннем інструментаў: лінія, прамавугольнік, авал, аловак, заліўка (напрыклад, рыбка ў акварыуме).

Білет № 6

1. Асноўныя аперацыі з файламі і папкамі ў аперацыйнай сістэме Windows (стварэнне, перайменаванне, капіраванне, перанос, выдаленне). Праграма Праваднік.

2. Заданне на фармаціраванне абзацаў прапанаванага тэксту (водступ злева, водступ справа, выраўноўванне, міжрадковая адлегласць, водступ першага радка, інтэрвал перад абзацам і пасля яго).

Білет № 7

1. Асноўныя алгарытмічныя канструкцыі. Прыклады.

2. Заданне на настройку анімацыі аб'ектаў (тэкставых, графічных) і змены слайдаў у прэзентацыі.

Білет № 8

1. Паняцце сеткі Інтэрнэт. Асноўныя сэрвісы сеткі Інтэрнэт і іх прызначэнне.

2. Заданне на ўстаўку ў тэкст аднаго з аб’ектаў: сімвала, рысунка, дэкаратыўнага тэксту (на выбар вучня).

Білет № 9

1. Аперацыі з фрагментам тэксту.

2. Заданне на выкананне аперацый з прапанаваным растравым відарысам (вылучэнне, перанос, змяненне памеру, выдаленне, капіраванне).

Білет № 10

1. Паняцце алгарытму. Спосабы запісу алгарытму. Прыклады.

2. Заданне на стварэнне і рэдагаванне прапанаванага тэксту.

Білет № 11

1. Прызначэнне антывірусных праграм.

2. Заданне на стварэнне тэксту з выкарыстаннем спісаў.

Білет № 12

1. Паняцце камп’ютарнай прэзентацыі. Прызначэнне і магчымасці праграм для стварэння прэзентацый.

2. Заданне на стварэнне і афармленне табліцы ў прапанаваным тэксце.

Білет № 13

1. Прадстаўленне інфармацыі ў камп’ютары. Адзінкі вымярэння аб’ёму інфармацыі.

2. Заданне на вылічэнне значэння арыфметычнага выразу на мове праграмірання.

Білет № 14

1. Прызначэнне тэкставага рэдактара. Тыпавыя задачы апрацоўкі тэксту.

2. Заданне на стварэнне камп’ютарнай прэзентацыі (2 – 3 слайды).

Білет № 15

1. Паняцце растравай графікі. Прызначэнне графічнага рэдактара. Тыпавыя задачы апрацоўкі графічнай інфармацыі.

2. Заданне на стварэнне прапанаванай структуры папак на ўказаным дыску.

Білет № 16

1. Паняцце мультымедыя. Склад мультымедыя: тэкст, графіка, гук, анімацыя, відэа.

2. Заданне на вызначэнне выказвання (напрыклад, якія са сказаў з’яўляюцца выказваннямі), на вызначэнне праўдзівасці выказвання, на пабудову адмаўлення выказвання.

Білет № 17

1. Паняцце лакальнай камп’ютарнай сеткі. Выкарыстанне агульных рэсурсаў сеткі.

2. Заданне на дадаванне элементаў (аб’ектаў) у мноства (напрыклад, дапоўніце мноства 1–2 элементамі: A = {матэматыка, інфарматыка, гісторыя, літаратура}), на перасячэнне і аб’яднанне мностваў.

Білет № 18

1. Логіка выказвання: паняцце выказвання, лагічныя аперацыі (не, і, або).

2. Заданне на ўстаўку прапанаванай формулы ў тэкст.

Білет № 19

1. Мноства: паняцце мноства, паняцце падмноства. Аперацыі з мноствамі.

2. Заданне на стварэнне растравага відарыса па прапанаваным ўзоры з выкарыстаннем аперацый адлюстравання і павароту.

У білетах па вучэбным прадмеце «Інфарматыка» сфармуляваны практычныя заданні ў агульным выглядзе. Настаўнікі самі складаюць або падбіраюць канкрэтныя варыянты практычных заданняў. У білеты варта ўключаць практычныя заданні, выкананне якіх дазваляе праверыць уменне вучняў прымяняць атрыманыя веды на практыцы, а таксама ўзровень падрыхтоўкі вучняў па вучэбным прадмеце.

Выкананне практычных заданняў па інфарматыцы ажыццяўляецца з выкарыстаннем персанальнага камп’ютара. Для гэтага адводзіцца дадатковы час да 40 хвілін.